© Пачатковае навучанне: сям’я, дзіцячы сад, школа № 1/2025

***Лупсякова А. У.***, *наместнік дырэктара па вучэбнай рабоце, настаўніца пачатковых класаў сярэдняй школы № 11 г. Жлобіна Гомельская вобласці*

# Квест-гульня «Юныя моваразнаўцы», прысвечаная Дню роднай мовы

## Лакацыя «З рога ўсяго многа»

Злучыце пачатак з аднаго слупка і канец з другога, каб атрымаліся прыказкі.

За кожную прыказку — 1 бал.

| | |
|---|---|
| Свая хатка — родная матка, | чым жыццё ў няволі. |
| Лепш смерць на полі, | і зроблена насмех. |
| Роблена наспех | а чужая — мачыха. |
| Вялікага дуба | не лапці плесці |
| Гаспадарку весці — | рана гаспадыню будзіць. |
| Студзень хаты студзіць, | з малым карэннем не бывае. |

## Лакацыя «Метаграма»

Метаграма — гэта загадка, але незвычайная. У ёй зашыфраваныя розныя словы — не адно, як у звычайнай загадцы. Складаюцца гэтыя словы з аднолькавай колькасці літар. Калі вы адгадаеце адно слова, другое можна адгадаць, змяніўшы адну ці некалькі літар.

За кожную адгаданую метаграму вы атрымаеце 2 балы, а за дзве метаграмы — 4 балы.

З ***м*** расту я на градзе,
З ***р*** я поўзаю ў вадзе.

______________________________

У лесе з ***б*** мяне шукаеш
І з прыемнасцю зразаеш.
Калі ***б*** на ***п*** заменіш —
Сцеражыся — захварэеш!

______________________________

## Лакацыя «Свет фразеалогіі»

Узнавіце у памяці знаёмыя фразеалагізмы. На картках вам неабходна будзе выбраць правільны працяг фразеалагізма. Няправільнае слова ці словы патрэбна закрэсліць.

За кожны правільны фразеалагізм — 1 бал.

| | |
|---|---|
| Кату па (галаву, пяту) | |
| Апусціць (ногі, нос) | |
| Цягне ката за (вуха, нос, хвост, ногі) | |
| Выходзіць сухім з (ракі, вады, мора, возера) | |
| Месца пад (дрэвам, сонцам, домам) | |

## Лакацыя «Літаратурная шыфроўка»

Заданне з сакрэтам. У прозвішчах пісьменнікаў літары перастаўленыя і прозвішчы сталі зашыфраваныя. Ваша задача — паставіць літары так, каб можна было прачытаць прозвішчы пісьменнікаў.

За кожнае правільны адказ вы атрымаеце 1 бал.

| | |
|---|---|
| такёц | |
| куаалп | |
| алсок | |
| бркоўа | |

© Пачатковае навучанне: сям’я, дзіцячы сад, школа № 1/2025

## Лакацыя «Рэбусы»

Перад вамі малюнкі-рэбусы, у якіх зашыфраваныя словы.

Ваша задача — назваць, якое слова зашыфравана.

| |
|---|
|  + л |
|  + сон |
| ану +  , |
| па +  ,, |

## Лакацыя «Бабулін куфэрак»

На гэтай лакацыі вам спатрэбіцца тэлефон з выхадам у інтэрнэт.

Вы павінны прасканіраваць QR-код, выканаць заданне і паказаць мне фразу, якая з’явіцца, калі заданне будзе выканана правільна. Так вы атрымаеце 4 балы.

## Лакацыя «Пазл»



*Дадатак 1*

**Маршрутны ліст каманды ________________________________**

| № п/п | Назва лакацыі | Месца знаходжання | Колькасць балаў |
|---|---|---|---|
| 1 | З рога ўсяго многа | | |
| 2 | Метаграма | | |
| 3 | Свет фразеалогіі | | |
| 4 | Рэбусы | | |
| 5 | Літаратурная шыфроўка | | |
| 6 | Бабулін куфэрак | | |
| 7 | Пазл | | |
| | | Усяго | |